

ПРАФЕСІЙНАЯ «КУХНЯ» ПЕДАГОГА 5



САКРЭТЫ ТРАЕЦКАГА ПРАДМЕСЦЯ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 КРАСАВІКА 2021 г.

АЎТОРАК

№ 63 (29432)


З першых вуснаў

# «Ідзе інфармацыйная вайна»

**Кіраўнік дзяржавы зрабіў кадравыя перастаноўкі ў Адміністрацыі Прэзідэнта і Міністэрстве інфармацыі.**

## «З ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК АДНАГО»

Уладзімір Пярцоў, які да ўчарашняга дня быў дырэктарам прадстаўніцтва Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір», назначаны міністрам інфармацыі Беларусі. Былы кіраўнік гэтага ведамства Ігар Луцкі зойме месца намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

«Ідзе інфармацыйная вайна. Ужо не праціўборства, хацелася б, каб было толькі праціўборства. Баюся, што далей будзе горш у плане інфармацыйнага супрацьстаяння. І вядома, кожнага чалавека, які сёння будзе займацца гэтым супрацьдзеяннем, падбіраем ужо, выкрышталізоўваючы з грамадства, з тысяч чалавек аднаго», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што Уладзіміра Пярцова ведае вельмі добра, і яго кандыдатуру разглядалі на розныя пасады. Але, па словах кіраўніка краіны, дагэтуль «чыноўніцкія» пасады для Уладзіміра Пярцова ён адхіляў: непакоіцца, каб новы міністр не патануў у чыноўніцкай руціне. «Вельмі будзе шкада, калі мы страцім добрага журналіста, палітолага і палітыка, скажу шчыра. Ды і ў сям'і ў вас ёсць з кім параіцца. Ёсць чалавек, які можа выказаць сваю пазіцыю, якога я вельмі паважаю», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, маючы на ўвазе свёкра Уладзіміра Пярцова, былога першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Радзькова.

«Міністр усё-такі крыху далей ад гэтага кіпучага катла, і там ёсць вельмі добры практычны складнік, — сказаў Прэзідэнт. — Увогуле, вы яшчэ малады чалавек, усё наперадзе. Я вельмі хачу, каб у вас на пасадзе члена ўрада атрымалася».



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка працягнуў, што знайсці новага чалавека і ў Адміністрацыю Прэзідэнта было няпроста. Ён назваў Ігара Луцкага чалавекам надзейным, ідэалагічна вытрыманым, у якім не сумняваецца.

Ён выказаў меркаванне, што Ігару Луцкаму будзе лёгка на пасадзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта, бо работу гэтага ведамства той бачыў збоку, аналізаваў.

«Тым не менш вам абодвум прыйдзецца арганізоўваць гэты працэс. Вы (Ігар Луцкі. — **«Зв.»**) як чалавек, які папрацаваў у Мінінфарме, можаце многае параіць, падказаць, а дзесьці і падключыцца да нейкіх пытанняў — без гэтага нельга. А Уладзімір Барысавіч (Пярцоў. — **«Зв.»**) як адзін з вядучых палітолагаў, журналістаў і палітыкаў можа падставіць плячо ў любы час у гэтай арганізацыйнай структуры, якую вам прыйдзецца ўдваіх выбудоўваць», — лічыць Прэзідэнт.

## ПОЛЕ ДЗЕЙНАСЦІ — КАДРЫ І ЭКАНОМІКА

Мікалай Рагашчук, намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама, назначаны памочнікам Прэзідэнта па Гомельскай вобласці, а старшыня Горацкага райвыканкама Аляксандр Бутараў — на гэту ж пасаду, толькі ў Мінскай вобласці.

«Пасады няпростыя, няхай у вас і вопыт прыстойны», — пачаў размову з прызначэнцамі Прэзідэнт.

Аляксандр Бутараў раней займаў кіруючыя пасады ў чатырох райвыканкамах Магілёўскай вобласці. Таму Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пераезды па рабоце заўсёды ўспрымаюцца няпроста, але гэта мае карысць. «Гэта добра, але перамяшчэнні па службе заўсёды цяжка ўспрымаюцца чалавекам. Я ўвогуле не ўяўляю, як магчыма чатыры разы пераехаць, як чалавек, які вельмі моцна прывязваецца да месца», — дадаў кіраўнік краіны.

СТАР. 2

# Сяўба пад гмахамі

На гэтым фота — механізатар сельгаспрадпрыемства «Козенкі-Агра» Мазырскага раёна Аляксандр СУЗЬКО і галоўны аграном Ілья ПАПЛАВЕЦ на полі, дзе ідзе сяўба яравога ячменю. У гаспадарцы яравы збожжавы клін складае 4500 гектараў, частка якога прыпадае на гарадскія плошчы. І на адным з іх якраз ідзе сяўба, што праводзіць трактарыст з адзінаццацігадовым механізатарскім стажам.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**





ЦЫТАТА ДНЯ



**ПРЭС-СЛУЖБА ЎРАДА:**

*«Рэспубліканскі суботнік пройдзе 17 красавіка. 50 % зробленых у гэты дзень грашовых сродкаў плануецца накіраваць Міністэрству аховы здароўя на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы медыцынскіх устаноў, у тым ліку на закупку абсталявання для аказання планавай і экстраннай медыцынскай дапамогі насельніцтву і частковае фінансаванне закупак вакцыны ад COVID-19 для забеспячэння даступнасці вакцынацыі для насельніцтва. Астатнія 50 % зробленых на суботніку грашовых сродкаў застануцца ў распараджэнні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Іх плануецца накіраваць на рамонт, рэканструкцыю, рэстаўрацыю, аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцяў, мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы часоў Вялікай Айчыннай вайны».*

Камунальныя стасункі

# ЭЛЕКТРОННЫЯ СЭРВІСЫ ЖКГ

### Экапраекты, разумны дом для разліку сабекошту паслуг і картаграфія

**Заказаць дадому сантэхніка ў зручны для жыхара час. Даведацца праз вайбер, калі спецыялісты справяцца з аварыяй. Пракантраляваць, дзе знаходзіцца смеццявоз. Усё гэта і шмат што іншае, мяркуецца, змогуць неўзабаве рабіць мінчане праз зручныя сэрвісы. Пра сістэму электронных паслуг у Мінску, пашырэнне іх функцыянальных магчымасцяў і перспектыўныя праекты расказалі спецыялісты Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама.**

## Поўная алічбоўка і кіраванне прастораў

З пункту гледжання інфарматызацыі ў Мінску, пэўна, самае цікавае і штодзённае для людзей — гэта сістэма ЖКГ, дакладней — служба 115, — адзіны цэнтр прыняцця заяў ад грамадзян і каардынацыі ўсіх паслуг у гэтай сферы, лічыць **Іван БУТУК, вядучы бізнес-аналітык Цэнтра інфармацыйных тэхналогій (ЦІТ) Мінгарвыканкама:**

*— Для паляпшэння сістэмы шмат робіцца ў тэхнічнай, арганізацыйнай і каардынацыйнай частцы. Служба 115 эвалюцыянуе, развіваючыся ў платформу, агульную для ўсёй сістэмы ЖКГ краіны. Задача — **стварыць дзяржаўную інфармацыйную сістэму ЖКГ,** якая не толькі аб'яднае службу 115 з яе ўнутранымі сэрвісамі, але і пачне пашыраць свае сэрвісы за кошт геаінфармацыйных сістэм (картаграфіі), а таксама ствараць умовы для разумнага кіравання дамамі на ўзроўні ЖЭУ і кожнага раёна, прычым не толькі ў сталіцы, але і па ўсёй краіне.*

Да службы 115 заўжды шмат пытанняў. У прыватнасці, адносна якасці аказання паслуг водазабеспячэння. Спецыялісты разважаюць, як можна аўтаматызаваць сістэму інфармавання грамадзян, каб як мага хутчэй яны атрымлівалі інфармацыю, што на пэўным участку здарылася аварыя і калі яе плануюць устараніць. Мяркуюць стварыць шматканальную сістэму інфармавання праз усе сродкі камунікацый: тэлеграм, вайбер, мабільныя праграмы, сайт.

СТАР. 2

Прыёмная кампанія — 2021



# ЭКЗАМЕН З ВЫСОКІМІ СТАЎКАМІ

### Ці стане ЦТ у гэтым годзе больш складаным для абітурыентаў?

**У Беларусі створана сур'ёзная сістэма экспертызы матэрыялаў для ЦТ. Пра гэта паведаміла падчас круглага стала ў прэс-цэнтры БелТА намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Наталля ВАЙЦЯХОВІЧ.**

— Тэсты — гэта той інструментарый, якім мы вымяраем узровень падрыхтоўкі нашых абітурыентаў і ранжыруем іх для таго, каб яны маглі працягнуць далей вучобу ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, — падкрэсліла яна. — Працэдура стварэння тэставых матэрыялаў распачынаецца са стварэння творчых калектываў. Як правіла, аўтары тэставых заданняў — гэта практыкі: настаўнікі, выкладчыкі, якія ведаюць навучальныя праграмы і добра вызначаюць узровень складанасці тэставых заданняў. Далей ідзе шматступенная экспертыза. Па кожным прадмеце працуе цэлая група экспертаў.

Адным з найважнейшых аспектаў з'яўляецца вызначэнне адпаведнасці тэставага задання пэўнай тэме, навучальнай праграме і праграме ўступных выпрабаванняў. Ацэньваецца збалансаванасць па ўзроўні складанасці, аналізуецца невербальная падтрымка — важна, каб яна была якасна падрыхтаваная.

«Апрабацыя тэставых матэрыялаў праходзіць у рамках рэпетыцыйнага тэсціравання. Мы атрымліваем важную статыстычную і аналітычную інфармацыю, якая дапамагае нам працаваць над тэставымі заданнямі, — патлумачыла Наталля Вайцяховіч. — Гэта значыць, што тыя заданні, якія маюць нездавальняльныя статыстычныя характарыстыкі, выбракоўваюцца, мы іх перапрацоўваем альбо карэкціруем для таго, каб наша база тэставых заданняў папаўнялася толькі якаснымі матэрыяламі».

СТАР. 3

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У В'етнаме абралі прэзідэнта і прэм'ера



Абраны прэзідэнтам Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам (СРВ) Нгуен Суан Фук прынёс прысягу на вернасць Радзіме, кіруючай Камуністычнай партыі В'етнама (КПВ) і народу краіны. Цырымонія ўступлення на пасаду кіраўніка дзяржавы прайшла адразу ж пасля абвяшчэння вынікаў праведзенага дэпутатамі Нацыянальнага сходу (аднапалатнага парламента) галасавання па выбарах прэзідэнта рэспублікі. Нгуен Суан Фук, які з 2016 года займаў пасаду прэм'ер-міністра СРВ, стаў 11-м прэзідэнтам у гісторыі сучаснага В'етнама і першым кіраўніком дзяржавы, які ўзначальваў да абрання ўрад краіны. На пасадзе прэзідэнта СРВ Нгуен Суан Фук змяніў генеральнага сакратара Цэнтральнага камітэта (ЦК) КПВ Нгуен Фу Чонга. 96,25 % дэпутатаў Нацсхода падтрымалі загадчыка арганізацыйнага аддзела ЦК КПВ Фам Мінь, які быў абраны прэм'ер-міністрам краіны на перыяд 2021—2026 гадоў. Рашэнне аб ратацыі вышэйшых кіруючых кадраў, уключаючы прэзідэнта, прэм'ер-міністра і старшыню парламента, было прынятае на студзеньскім з'ездзе КПВ.

## У Каіры прайшоў «залаты парад фараонаў»

Урачыстая цырымонія па перавозцы мумій егіпецкіх фараонаў прайшла ў егіпецкай сталіцы. Пра гэта паведаміла BBC News. У выніку 22 муміі (18 фараонаў і чатыры царыцы) былі перавезены з Каірскага егіпецкага музея ў Нацыянальны музей егіпецкай цывілізацыі. Працэсія ішла ў храналагічным парадку ўладарання. Абмежаванні з-за пандэміі на правядзенне сходаў пад адкрытым небам былі знятыя. Грандыёзная цырымонія была названа яе арганізатарамі «залатым парадам фараонаў». Падчас пераезду муміі былі змешчаны ў спецыяльныя скрыні, запоўненыя азотам. Такі спосаб дапамагае засцерагчы іх ад знешніх разбуральных фактараў. Дарогі ўздоўж маршруту таксама былі перамошчаны, каб забяспечыць плыўнасць руху. Новыя экспанаты будуць выстаўлены на ўсеагульны агляд з 18 красавіка. Зала Нацыянальнага музея егіпецкай цывілізацыі была спраектавана такім чынам, каб стварыць адчуванне прысутнасці ў Даліне Цароў у Луксоры. Акрамя таго, налета побач з пірамідамі ў Гізе павінен адкрыцца новы Вялікі Егіпецкі музей, у якім будзе захоўвацца знакамітая калекцыя Тутанхамона.



## Асабістыя даныя больш чым паўмільярда карыстальнікаў Facebook трапілі ў сетку

Даныя звыш 533 мільёнаў карыстальнікаў Facebook былі апублікаваныя на хакерскім форуме, паведаміла выданне Business Insider. У адкрыты доступ трапіла асабістая інфармацыя карыстальнікаў Facebook са 106 краін, уключаючы ЗША, Вялікабрытанію і Індыю. У базе апынуліся поўныя імёны карыстальнікаў, тэлефонныя нумары, ідэнтыфікатары Facebook, адрасы, даты нараджэння, біяграфічныя даныя і адрасы электроннай пошты. Элан Гэл, тэхнічны дырэктар кампаніі па кібербяспецы Hudson Rock, першы выявіў увесь аб'ём уцечак даных у інтэрнэце. На яго думку, кіберзлачынцы могуць атрымаць інфармацыю, якая дазволіць ім выдаць сябе за іншых людзей або падманам прымусіць перадаць уліковыя даныя для ўваходу.

ISSN 1990 - 763X

КОРАТКА

- **«Белавія» адновіць рэйсы ў Казань з 13 красавіка.**
- Супрацоўніца ўніверсітэта МНС выйграла «золата» на экстрэмальных бегавых стартах Bison Trail.



- **БМЗ засвоіў вытворчасць сямі новых відаў металапрадукцыі.**
- Праз расійскія парты ўжо адгружана больш за 220 тысяч тон беларускіх нафтапрадуктаў.
- **Беларуская калійная кампанія падпісала кантракт на пастаўкі ўгнаенняў у Індыю па $ 280 за тону**.
- Каманда БДУ выступіць у фінале чэмпіянату свету па праграмаванні.

Паехалі!

# АДКРЫВАЮЧЫ БЕЛАРУСЬ, АДКРЫВАЕШ СЯБЕ

### Як за выхадныя пазнаць гісторыю краіны — майстар-клас ад вопытных вандроўнікаў

**Эксперты ў турыстычнай сферы неаднаразова падкрэслівалі, што пандэмія каранавіруса і яе наступствы дапамаглі развіццю ўнутранага турызму. Беларусы, не маючы магчымасці выехаць за мяжу, нарэшце пачалі адкрываць уласную краіну. У падобнай сітуацыі аказаліся і Настасся Марыніна з мужам Аляксеем. Пара ўжо год вандруе па Беларусі і спыняцца не збіраецца.**



«Калі пачалася пандэмія, нам было псіхалагічна цяжка нават проста на вуліцу выйсці. Пасядзеўшы месяц дома, вырашылі, што так больш працягвацца не можа. Трэба скарыстацца магчымасцю адкрыць для сябе родную краіну. Мы ведалі, чыталі, што ў Беларусі мноства цікавых мясцін, і захацелі ўбачыць іх на свае вочы. Мы вандруем ужо больш за год. Але калі мне кажуць, што мы, напэўна, ужо аб'ездзілі ўсю Беларусь, адказваю, што толькі пачынаем, яшчэ нічога не бачылі», — дзеліцца Настасся Марыніна. Яна расказала «Звяздзе» аб асаблівасцях унутранага турызму, цікавых маршрутах і недахопах з пункту погляду турыста. Як аказалася, знайсці час на падарожжа могуць нават дастаткова занятыя людзі.

СТАР. 8

Надвор'е

# ПЕРШАКРАСАВІЦКІ ЖАРТ З ХОЛАДАМ ЗАЦЯГНУЎСЯ

## І толькі ў выхадныя злёгку пацяплее

**Халоднае надвор'е, якое адзначалася на тэрыторыі нашай краіны з першых дзён красавіка, падобна, захаваецца і на працягу ўсяго бягучага тыдня. У другой яго палове вецер падзьме з поўначы, чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Адносна пацяплее толькі ў суботу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Заўтра надвор'е будзе вызначаць халодная няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з паўночных шырот, у паўднёва-ўсходніх раёнах краіны адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту. Аблокаў будзе шмат. Месцамі па краіне, а па Гомельскай вобласці на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя ападкі — у асноўным мокры снег. Уначы і раніцай па паўднёвым усходзе ў асобных раёнах прагназуецца наліпанне мокрага снегу, на дарогах галалёдзіца. Вецер будзе пераменных напрамкаў, слабы да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, удзень — плюс 4—9 градусаў.

Дастаткова холадна будзе і ў чацвер. У гэты дзень захаваецца ўплыў халаднаватай няўстойлівай паветранай масы, якая распаўсюджваецца з паўночнага захаду Еўропы. Чакаецца воблачнасць з праясненнямі. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег. Вецер будзе паўночна-заходні, заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны будзе вагацца ад мінус 5 да плюс 1 градуса, удзень чакаецца ад 4 да 10 цяпла.

Надвор'е пачне выпраўляцца ў пятніцу. У апошні рабочы дзень тыдня атмасферны ціск павысіцца, паменшыцца колькасць аблокаў, у асноўным абыдзецца без ападкаў. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла. Удзень сонца пачне злёгку разаграваць вясновае паветра — будзе ад плюс 6 градусаў да 11 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у наступныя выхадныя ў тоўшчы атмасферы будуць уладарыць паўднёва-заходнія вятры, якія пачнуць пастаўляць у нашу краіну ўмерана цёплае паветра, і ў многіх рэгіёнах Беларусі пацяплее. Тэмпература паветра ўначы будзе ў асноўным 1—6 цяпла, месцамі ў суботу пры працяглых праясненнях — нуль — мінус 2 градусы. Удзень будзе плюс 8—14 градусаў, па поўдні паветра можа награвацца да 15—17 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Свае «метры»

# «ІЛЬГОТНАЕ» ЖЫЛЛЁ Ў СТАЛІЦЫ

**Пералік шматкватэрных і індывідуальных жылых дамоў, будаўніцтва і фінансаванне якіх у 2021 годзе ажыццяўляецца з выкарыстаннем ільготных крэдытных рэсурсаў, зацверджаны для горада Мінска. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва № 10, якая апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Згодна з гэтым пералікам, будаўніцтва 448 сталічных кватэр агульнай плошчай 29,3 тыс. кв. м і 611 кв. м індывідуальнага жылля будзе прафінансавана сёлета за кошт ільготных крэдытаў. Аб'ём ільготных крэдытных рэсурсаў ААТ «АСБ Беларусбанк» на гэтыя патрэбы прадугледжаны ў памеры Br16,161 млн, з іх на будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў будзе накіравана Br15,161 млн, на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва — Br500 тысяч і Br500 тысяч — на набыццё жылля.

На будаўніцтва аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры да жылых дамоў у 2021 годзе плануецца накіраваць з мясцовых бюджэтаў Br150 млн, і амаль Br22 млн будзе выдзелена з рэспубліканскага бюджэту.

Пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

АПК

# ФАБРЫКА МАЛАКА

## Новую ферму на 1200 галоў урачыста адкрылі ў сельгаспрадпрыемстве «Відамлянскае» Камянецкага раёна

**Гэты сучасны малочнатаварны комплекс, які будаўнікі «Палессежылбуда» ўзвялі за паўтара года, ужо ўведзены ў строй і дае першую прадукцыю. Новае прадпрыемства ўяўляе сабой інавацыйную аўтаматызаваную ферму з чатырох кароўнікаў і памяшкання даільнай залы, аснашчанай сучасным абсталяваннем.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Паводле слоў **дырэктара ААТ «Відамлянскае» Міхаіла СТРАПКО,** рэалізацыя інвестпраекта абышлася ў 19,8 мільёна рублёў. Гэта крэдытныя рэсурсы і сродкі гаспадаркі, у тым ліку кароткатэрміновыя займы ААТ «Савушкін прадукт» і Брэсцкага мясакамбіната.

«Відамлянскае» — адзін з найбуйнейшых вытворцаў малака ў сваім раёне. Летась тут атрымалі 13,5 тысячы тон малака. Сярэдні ўдой на карову склаў 6365 кілаграмаў. Амаль уся прадукцыя ідзе класам «экстра» альбо «вышэйшы».

На ўрачыстым адкрыцці комплексу пабываў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** Ён павіншаваў калектыў «Відамлянскага» з новым аб'ектам і адзначыў, што ўвядзенне яго ў строй азначае далейшае паляпшэнне ўмоў працы жывёлаводаў, іх годную зарплату, а таксама вытворчасць якасных прадуктаў харчавання, нарошчванне экспарту, што станоўча ўплывае на імідж краіны. Губернатар паведаміў таксама, што такія комплексы будуць узводзіцца ва ўсіх раёнах вобласці. Толькі сёлета пачнецца будаўніцтва альбо мадэрнізацыя 35 фермаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Тэнгізу Шукрыевічу Думбадзэ ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

На перспектыву

# АГУЛЬНАЯ СПРАВА



**Будаўнічая пляцоўка ў 96-м мікрараёне Гомеля, дзе ўзводзіцца ўнікальная для Гомельшчыны сучасная школа, стане абласной маладзёжнай будоўляй.**

У абласным цэнтры зараз актыўна рэалізуюць два буйныя сацыяльна значныя праекты бягучага года. Гэта ўзвядзенне новага корпуса бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі і будаўніцтва доўгачаканай школы ў 96-м мікрараёне Гомеля. Каля трохсот будаўнікоў у кругласутачным рэжыме працуе на аб'екце «Хутары» — пад такой назвай больш вядомы сярод гамяльчан 96-ы мікраараён.

З нулявога цыкла школу ўзводзіць прадпрыемства «Будаўнічы трэст № 14». Між тым, будпляцоўка будучай навучальнай установы цікавая для спецыялістаў-будаўнікоў як выдатная тэрыторыя практычнай падрыхтоўкі маладой змены. Так, на аб'ект штомесяц прыязджаюць навучэнцы будаўнічых спецыяльнасцяў устаноў адукацыі, каб на свае вочы ўбачыць усе этапы ўзвядзення маштабнага аб'екта. На будпляцоўцы прайшлі практычныя заняткі навучэнцы другога курса спецыяльнасці «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» філіяла «Гомельскі дзяржаўны дарожна-будаўнічы каледж імя Ленінскага камсамола Беларусі».

— Будаўнічы трэст № 14 распрацоўвае свой прафесійны стандарт, на які мы таксама арыентуемся падчас адукацыйнага працэсу, што дазваляе падрыхтаваць дасведчаных спецыялістаў для будучай работы на будпляцоўках. Нашы навучэнцы бралі ўдзел у будаўніцтве Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы, будаўніцтве шэрагу аб'ектаў жыллёвай забудовы, — адзначыў **дырэктар філіяла Гомельскі дзяржаўны дарожна-будаўнічы каледж імя Ленінскага камсамола Беларусі Вячаслаў ПІЛЬШЧЫКАЎ.**

Аб падрабязнасцях праходжання цікавых практычных заняткаў расказалі **выкладчыкі Алеся КАНАШ і Вікторыя КНІЖНІКАВА:**

— Стаяла задача вызначыць рухомасць бетоннай сумесі, якая паступіла на будаўнічую пляцоўку з вучэбна-вытворчага камбіната. Атрыманыя вынікі навучэнцы супаставяць з данымі ў дакуменце аб якасці бетоннай сумесі і зробяць выснову пра адпаведнасць марцы бетоннай сумесі заяўленай якасці. Важна, што была дадзена магчымасць вырабіць узоры-кубы, якія ў далейшым, пасля неабходнага набірання трываласці, будуць выпрабаваны ў лабараторных умовах каледжа на сучасным абсталяванні. Так навучэнцы самастойна змогуць вызначыць марку бетону па ўзроўні трываласці.

Маладую змену на аб'екце суправаджалі выпускнік архітэктурна-будаўнічага аддзялення каледжа Павел Нічыпорчык, які цяпер працуе на будоўлі геадэзістам, і трэцякурснікі каледжа Вікторыя Канцавенка і Максім Сцепаненка, што праходзяць тут вучэбную практыку на атрыманне кваліфікацыі рабочага.

— Правядзенне ўрокаў у вытворчых умовах непасрэдна на будаўнічай пляцоўцы — адна з самых эфектыўных формаў уключэння вучняў у будучую прафесійную дзейнасць. Такія вучэбна-практычныя заняткі дапамагаюць фарміраваць у іх уяўленне пра будучую прафесію, замацоўваць веды і ўменні, атрыманыя ў каледжы, — упэўнены **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Будаўнічы трэст № 14» Дзмітрый МУРАШКА.** Ён адзначыў, што сёння будучая гомельская школа — гэта фактычна агульнабеларускі будаўнічы аб'ект. Матэрыялы, якія тут выкарыстоўваюцца, прывозяць з прадпрыемстваў з розных куткоў краіны. Што датычыцца спецыялістаў, занятых на будоўлі, то на дапамогу асноўным падрадчыкам прыцягнулі некалькі субпадрадных арганізацый. Тэмп будаўнічых работ напружаны, а таму дадатковыя рабочая сіла лішняя не будзе.

Дзмітрый Мурашка расказаў, што хутка будпляцоўка сучаснай школы стане сапраўды абласной маладзёжнай будоўляй:

— Ужо ў найбліжэйшы час пачнуць уносіць сваю лепту байцы студэнцкіх атрадаў БРСМ, з лідарамі якіх ужо вядуцца перагаворы па фарміраванні атрадаў. Плануецца, што ў іх састаў увойдуць навучэнцы дарожна-будаўнічага каледжа і студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту.

Дарэчы, летась маладзёжны будаўнічы рух Гомельшчыны ўнёс значны ўклад падчас рэалізацыі яшчэ аднаго сацыяльна значнага аб'екта — будаўніцтва сярэдняй школы ў 21-м мікраараёне Гомеля. Тады рашэннем Гомельскага аблвыканкама аб'екту будаўніцтва быў прысвоены статус маладзёжнай будоўлі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота ААТ «Будаўнічы трэст № 14».**

Багацці нетраў

# ЗАДАЧА — ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПРЫРОСТ СЫРАВІНЫ

## Што шукаюць і што знаходзяць айчынныя геолагі

**Іх работа ў мінулым годзе ў першую чаргу была скіравана на ўмацаванне і развіццё мінеральна-сыравіннай базы для вытворчасцяў, якія сёння ёсць у краіне. Пра гэта расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіль КОЛБ.**

— Спецыялістамі Навукова-вытворчага цэнтра па геалогіі і РУП «ВА «Беларуснафта» быў забяспечаны прырост запасаў нафты. Папярэдне ацэненыя яе запасы пры плане 3 мільёны тон на пяцігодку склалі 4,15 мільёна тон, па прамысловых катэгорыях — 5,75 мільёна тон пры плане ў 5,1 мільёна тон. Таксама была завершана папярэдняя разведка новага для Беларусі віду карысных выкапняў — базальту. Па выніках праведзеных работ атрыманы запасы ў 83,2 мільёна тон. Адным з найбуйнейшых спажыўцоў базальтавай сыравіны ў краіне з'яўляецца ААТ «Гомельбудматэрыялы», якому неабходна ў сярэднім 60 тысяч тон у год. Зараз сыравіна імпартуецца з Украіны і Расіі. Акрамя таго, былі забяспечаны прыросты па мергельна-крэйдавых пародах для вырабу цэменту, сілікатных пяскоў, тых, што выкарыстоўваюцца для вытворчасці шкла.

Што датычыцца перспектыў работы геолагаў на новую пяцігодку, задачы стаяць такія ж, як і ў мінулым: неабходна забяспечыць прырост запасаў карысных выкапняў, якія запатрабаваны ў Беларусі, павысіць геалагічную вывучанасць тэрыторыі краіны.

— У найбліжэйшыя гады працягнем работу па вывучэнні базальтаў радовішча «Навадворскае» Пінскага раёна, у тым ліку іх тэхналагічных уласцівасцяў. Будуць арганізаваны разведачныя работы па пошуку вуглевадародаў для павелічэння здабычы нафты, асвойвацца новыя радовішчы мергельна-крэйдавых парод. Таксама трэба будзе забяспечыць максімальнае ўключэнне ў прамысловую распрацоўку радовішчаў карысных выкапняў, якія разведаны, але не распрацоўваюцца. Яны будуць уключацца з улікам эканамічнай мэтазгоднасці, перспектыў рэгіёнаў. Такая работа ўжо распачатая Мінпрыродай і Міністэрствам эканомікі, — адзначыў Васіль Колб.

За 2016—2020 гады ў распрацоўку перададзена 154 радовішчы розных відаў карысных выкапняў. Яшчэ адна важная задача — прапрацоўка заканадаўства аб канцэсіі, каб прыцягваць як беларускіх, так і замежных інвестараў у асваенне айчынных нетраў. І не толькі ў іх распрацоўку, але і ў геалагічнае вывучэнне.

**Начальнік геалагічнага аддзела Навукова-вытворчага цэнтра па геалогіі Ганна АКІНШАВА** расказала, што зараз іх работа вядзецца па двух напрамках. Першы — для агульнадзяржаўных патрэб, другі скіраваны на ўзнаўленне мінеральна-сыравіннай базы: гэта пошукі і разведка карысных выкапняў. «У мінулым годзе была завершана рэалізацыя мерапрыемстваў па праграме «Вывучэнне нетраў і мінеральна-сыравіннай базы». У яе рамках былі выкананы работы па рэгіянальным вывучэнні нетраў паўднёвага ўсходу Беларусі, нарошчванні ўласнага паліўна-энергетычнага патэнцыялу, пошуку і папярэдняй разведкі, падрыхтоўцы да прамысловага асваення новых радовішчаў, будаўнічых матэрыялаў, а таксама па засваенні падземнай гідрасферы, пошуку і разведцы прэсных падземных вод. Асноўным і найбольш значным вынікам выканання рэгіянальных работ на паўднёвым усходзе краіны можна лічыць стварэнне абноўленай і дэталізаванай геалагічнай асновы для сярэднемаштабных картабудаўнічых работ для гэтага рэгіёна», — адзначыла спецыяліст.

**Намеснік дырэктара філіяла па навуцы філіяла «Інстытут геалогіі» Навукова-практычнага цэнтра па геалогіі Вольга ВАСНЁВА** адзначыла, што адным з карысных выкапняў, якія ўдзельнічаюць у працэсе фармавання мінеральна-сыравіннай базы, з'яўляюцца падземныя воды. «Геолагі адкрываюць новыя радовішчы падземных вод, ацэньваюць рэсурсы і запасы, бураць свідравіны, праводзяць маніторынгавыя назіранні падземных вод. Іх прагнозныя эксплуатацыйныя рэсурсы па краіне ацэньваюцца ў 49,6 мільёна кубаметраў у суткі. Патэнцыйныя магчымасці выкарыстання падземных вод характарызуюцца і іх натуральнымі рэсурсамі, якія складаюць 43,6 мільёна кубаметраў у суткі. Больш за ўсё збалансавых запасаў прэсных падземных вод зацверджана па Мінскай вобласці. Маючы вялікі патэнцыял запасаў такіх вод, асноўная наша задача — захаваць рэсурсны патэнцыял».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Па сезоне

# ДАСТУПНЫ, КАРЫСНЫ І ТАННЫ

## У Гродзенскай вобласці пік па нарыхтоўцы бярозавіку

**Тут плануюць нарыхтаваць каля 1,1 тысячы тон соку. Прыродны напой прадаецца насельніцтву, паступае на перапрацоўку і нават экспартуецца. Як паведамілі ў Скідзельскім лясгасе, працэс нарыхтоўкі працягнецца да сярэдзіны красавіка. За гэты час тут мяркуюць сабраць 50 тон соку, што значна больш, чым летась.**



Фота Мікалая ЛАПІНА.

Кожнае падраздзяленне мае свае дзялянкі. Напрыклад, у Луненскім лясніцтве Скідзельскага лясгаса падсочана два ўчасткі, а гэта дзесьці тысяча бяроз. З кожнай у суткі паступае да 20 літраў соку. А ўсяго дрэва за кароткі сезон — сок бяжыць не больш за месяц — аддае каля 200, а то і 300 літраў прыроднага напою.

Калі раней сок куплялі ў спецыяльных пунктах продажу, то цяпер многія выязджаюць адразу на дзялянкі. Часцей за ўсё ў лес прыязджаюць гродзенцы, хоць гэта і не так блізка. Напрыклад, да Луненскага лясніцтва з Гродна 60 кіламетраў. Асаблівы наплыў у выхадныя. Ляснічы Луненскага лясніцтва Аляксандр Залеўскі расказаў, што апошнім часам гараджане прыязджаюць па сок цэлымі сем'ямі. І гэта становіцца для дзяцей сапраўдным атракцыёнам. Яны могуць убачыць працэс нарыхтоўкі, прайсціся па лесе, паназіраць за прыродай. Пакупнік, у сваю чаргу, можа ацаніць якасць соку, наколькі ён чысты, ці няма там прымесяў, выбраць патрэбны аб'ем. Цана — 20 капеек за літр пры пакупцы на месцы. Гэта ў два-тры разы танней, чым вада ў краме. Пры тым, што карысць бярозавіка нікім не аспрэчваецца. Многія купляюць па некалькі дзясяткаў літраў.

Самім нарыхтоўваць сок можна толькі на дазволеных участках лесу, якія вызначаны для гэтых мэтаў. За браканьерства штраф — ад 20 да 30 базавых велічынь (580—870 рублёў), для ІП — да 100 базавых (2900 рублёў). Праўда, такіх выпадкаў пакуль не было. Бо атрымаць дазвол нескладана. Для гэтага варта звярнуцца ў найбліжэйшае лясніцтва, дзе пакажуць участкі для збору соку. І чалавек са сваёй тарай (звычайна гэта вялікія поліэтыленавыя мяшкі) зможа нарыхтаваць патрэбны аб'ем.

Дарэчы, сёлета купіць бярозавік можна праз смартфон. Гродзенскі лясгас стаў першым у вобласці, які прымае плацяжы праз сістэму АРЫП. Гэтую сістэму запусцілі якраз напярэдадні нарыхтоўкі бярозавага соку для зручнасці плацяжу.

І хоць сок сёлета пайшоў амаль на два тыдні пазней, чым летась, нарыхтаваць яго плануюць значна больш. Актывізавалася вытворчасць. Для гэтых патрэб у Луненскім лясніцтве нават арганізаваны яшчэ адзін участак. Асноўныя спажыўцы — Гродзенскі кансервавы завод і фірма ABC. На прадпрыемствы амаль штодзень адпраўляецца па дзве-тры тоны соку. Зараз самы пік нарыхтоўкі. Сок ідзе даволі актыўна, таму і нарыхтаваць яго плануюць у Скідзельскім лясгасе значна больш, чым летась.

Згодна з лабараторнымі аналізамі, цукровасць у норме. Магчыма, скароціцца час ходу соку, але гэта залежыць ад надвор'я. Спецыялісты мяркуюць, што яшчэ два тыдні напой можна збіраць. А вось калі на бярозах з'явяцца першыя лісцікі, сок перастае ісці ці мутнее, і тады дрэва «запячатваюць» — замазваюць сумессю вапны і гліны. Па словах Аляксандра Залеўскага, у асноўным падсочваюцца старыя бярозы, многім з якіх па 70 гадоў. Такія ўчасткі на працягу пяці гадоў будуць аднаўляцца.

Усяго ў вобласці плануюць нарыхтаваць каля 1,1 тысячы тон соку. А ўсяго ў Беларусі, згодна з інфармацыяй прэс-службы Мінлясгаса, — да 14 тысяч тон.

Цікава, што сок папулярны не толькі ў нас, але і ў многіх іншых краінах. Выкарыстоўваюць яго па-рознаму. У Швейцарыі, напрыклад, вырабляюць віно і прымяняюць пры вырабе моцных алкагольных напояў. Канадцы аддаюць перавагу бярозаваму сіропу, а вось дацкія сыравары сок дадаюць у свой прадукт.

Не выходзіць бярозавік з моды і ў беларусаў. З яго робяць квас, кансервуюць з лімонам і цукрам, дадаюць разынкі ці падсушаныя скарынкі чорнага хлеба. Але, вядома, самы карысны — свежы бярозавік. І хоць ён не панацэя ад усіх хвароб, але даволі даступны сродак для ўмацавання імунітэту. Асабліва ў вясновы перыяд авітамінозу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ЭКЗАМЕН З ВЫСОКІМІ СТАЎКАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наталля Вайцяховіч праінфармавала, што для больш дакладнага вымярэння ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў сёлета былі ўнесены некаторыя змены ў структуру тэстаў: «Тэст традыцыйна складаецца з часткі А, дзе прапануюцца закрытыя заданні з выбарам адказу, і часткі Б, дзе абітурыенту неабходна адказ упісаць самому. У гэтым годзе адбылося некаторае змяншэнне колькасці заданняў у частцы А і павелічэнне заданняў у частцы Б. Ёсць змены і ва ўзроўнях складанасці заданняў: мы ўвялі пяты варыянт адказу. Павялічылася таксама колькасць практыка-арыентаваных заданняў. Увогуле, мы нацэлены на тое, каб абітурыент пры рабоце над тэстам не проста дэманстраваў тэарэтычныя веды, але і разам з тым паказаў, як ён можа іх прымяняць.

Досыць шмат заданняў з невербальнай формай падтрымкі, калі выкарыстоўваюцца дыяграмы і графікі. Усе гэтыя змены адлюстраваны ў спецыфікацыі тэстаў. Толькі два прадметы — руская і беларуская мовы — практычна не зведалі зменаў».

— Аналіз заданняў рэпетыцыйнага тэсціравання на іх адпаведнасць навучальным праграмам і праграмам уступных выпрабаванняў — не ноу-хау гэтага года, — падкрэслівае **прарэктар па метадычнай рабоце Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Святлана УКЛЕЙКА.** — Такая работа праводзіцца на пастаяннай аснове сумесна з Нацыянальным інстытутам адукацыі і Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў. Але хацелася б звярнуць увагу на некалькі важных аспектаў. Першае — экспертыза заданняў рэпетыцыйнага тэсціравання ажыццяўляецца рабочымі групамі, у склад якіх уваходзяць метадысты Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі, а таксама настаўнікі-практыкі па кожным вучэбным прадмеце. Пры гэтым трэба адзначыць, што пераважная большасць з іх — гэта настаўнікі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі або кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст», спецыялісты з самым высокім узроўнем прафесійнай кампетэнтнасці.

У складзе рабочай групы настаўнікі прадстаўляюць усе асноўныя віды устаноў агульнай сярэдняй адукацыі: гімназіі, школы, ліцэі (установы адукацыі, размешчаныя як у гарадской, так і ў сельскай мясцовасці). Кожны член рабочай групы праводзіць экспертызу заданняў рэпетыцыйнага тэсціравання аўтаномна, незалежна адзін ад аднаго. Ён робіць сваё заключэнне і перадае яго кіраўніку рабочай групы. Затым пачынаецца этап абагульнення, калі кіраўнік групы аналізуе ўсе прадстаўленыя меркаванні. Высновы дзеляцца на дзве групы: агульныя і індывідуальныя. Безумоўна, калі з'яўляюцца нейкія індывідуальныя высновы, то праходзіць паўторная экспертыза. Выніковае заключэнне па кожным вучэбным прадмеце аналізуецца сумесна з супрацоўнікамі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі, а затым перадаецца ў Міністэрства адукацыі і ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў.

**Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК** запэўніў абітурыентаў: «Трэба проста мець добрыя веды, а тэст дазволіць іх аб'ектыўна і добрасумленна ацаніць. Невялікія змены ў тэстах — увядзенне дадатковых дыстрактараў (варыянтаў адказаў у закрытых заданнях. — **Аўт.**), скарачэнне часткі А і пашэрынне часткі Б — усё гэта рабілася для таго, каб абараніць менавіта добрасумленных абітурыентаў. Пры гэтым мы дакладна ставілі сабе задачу: тэст не павінен стаць больш скаладаным».

Паводле слоў арганізатараў ЦТ, каб пераканацца ў тым, што тэст сапраўды не стаў больш складаным, быў праведзены параўнальны аналіз вынікаў абітурыентаў, якія выконвалі рэпетыцыйнае тэсціраванне падчас першага і другога этапаў. «Другі этап праводзіўся ўжо па новай структуры тэсту. Мы пераканаліся на прыкладзе матэматыкі, што сярэдняя колькасць дакладна выкананых заданняў некалькі вырасла, — кажа Юрый Міксюк. — Калі разглядаць абітурыентаў, якія ўдзельнічалі ў першым і другім этапах, то ў другім яны паказалі такі ж або нават лепшы вынік. У цэлым абітурыенты сталі вырашаць больш задач, іх вынікі таксама крыху выраслі. Значыць, падстаў для хвалявання няма. Абітурыентам застаецца толькі прыйсці на ЦТ са сваімі ведамі, з добра адпрацаванай тэхналогіяй запаўнення бланкаў і сканцэнтраваць увагу на выкананні тэста. Веды кожнага будуць аб'ектыўна і належна ацэнены».

На Нацыянальным адукацыйным партале можна знайсці электронныя версіі ўсіх навучальных дапаможнікаў, актуальных для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання ў 2021 годзе. Пра гэта паведаміла **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна ГІНЧУК.**

Ужо не першы год пасля правядзення выпускных вечароў для адзінаццацікласнікаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі арганізоўваюцца кансультацыі па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання. Гэта практыка добра зарэкамендавала сябе і будзе працягнута. Выпускныя вечары плануецца правесці сёлета 10 чэрвеня, а з 11 да 15 чэрвеня ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі будуць праведзены кансультацыі па падрыхтоўцы да ЦТ.

А да канца красавіка можна яшчэ прайсці трэці раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання. Таксама з 26 сакавіка на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў адукацыі даступна паслуга праходжання трэцяга этапу рэпетыцыйнага тэсціравання ў анлайн-рэжыме. Яно праводзіцца паралельна з традыцыйнай вочнай формай. Пры гэтым варыянты педагагічных тэстаў, якія прапануюцца абітурыентм у вочной форме і анлайн, розныя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Шануй сваё

# «Важна беражліва адносіцца і да рэшткаў архітэктуры»

## Акадэмік Аляксандр ЛАКОТКА стварае яркія акварэлі і адкрывае феномен беларускага дойлідства

**Нядаўна дзякуючы выстаўцы ў Нацыянальным гістарычным музеі мы адкрылі для сябе дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, акадэміка Аляксандра Лакотку, знаўцу і абаронцу архітэктурных помнікаў, з новага боку: як мастака. Яго акварэлі — яркія, свежыя, сакавітыя, як кажа сам аўтар, «мажорныя». Але і яны прысвечаны галоўнай тэме яго жыцця — беларускаму дойлідству і яго сакрэтам, пра якія мы і пагаварылі.**

***— Вас ведаюць як вядомага вучонага, вы доктар гістарычных навук і доктар архітэктуры, акадэмік, прафесар... Маляванне для вас частка прафесіі ці ўсё ж хобі?***

— Мой бацька быў мастаком, працаваў у школе і ствараў вельмі цікавыя ілюстрацыі да літаратурных твораў. Таксама ў нашай школе быў тэатр: ставіліся спектаклі, і трэба было рабіць дэкарацыі. Таму я займаўся жывапісам і графікай з ранняга дзяцінства. Скончыў архітэктурны факультэт БНТУ. Ну і, як той казаў, гэта стала



патрэбай жыцця, таму што каб не было ўнутранага памкнення да малявання, я і на архітэктурны, мабыць, не паступіў бы. Потым я працаваў у галіне рэстаўрацыі ў Музеі народнай архітэктуры і побыту, даводзілася бываць у шматлікіх экспедыцыях: усё гэта давала матэрыял. Я знаёміўся з гарадамі, мястэчкамі, помнікамі, вёскамі і хутарамі, а таксама з прыгожымі пейзажамі розных рэгіёнаў Беларусі. І маляваў...

***— Як вы вызначылі феномен беларускага дойлідства? У чым ён?***

— Гэта вынік маёй доктарскай дысертацыі. Я працаваў у навуковай галіне архітэктуры прыкладна з семдзесят сёмага года. Ролю ў гэтым сыгралі і шматлікія падарожжы і экспедыцыі. Аднойчы мы праехалі па Беларусі дзевяць тысяч кіламетраў. Таму я маю канкрэтнае і сапраўднае ўяўленне пра нашу архітэктуру. Феномен палягае ў сінтэзе будаўнічых культур Усходу і Захаду. Гэта вельмі добра відаць: менавіта тут перадавая пазіцыя нашага дойлідства. Усё найлепшае, што было створана ўсходнеславянскімі і заходнімі культурамі, адлюстравана ў ім. І тое не проста словы: паглядзіце на нашы цудоўныя храмы, як праваслаўныя, так і каталіцкія. Звярніце ўвагу на замкі, якія цяпер рэстаўруюцца. Іншая справа, што наша краіна, і я хацеў бы, каб гэта прагучала, адносіцца да тых частак еўразійскага кантынента, якія больш за ўсіх пацярпелі ад шматлікіх войнаў розных стагоддзяў. Напрыклад: замкі, якіх было каля двухсот, а я іх падлічваў, калі пісаў дысертацыю, амаль усе былі знішчаны ў гады Паўночнай вайны. Шведы проста іх узарвалі самым натуральным чынам. І таму наша краіна пакрытая руінамі гэтых замкаў. Але руіны — гэта таксама вельмі важны помнік. Паглядзіце на Захад, як у той жа Англіі такія руіны інсталююцца і пазіцыянуюцца. Таму для нас важна беражліва адносіцца і да рэшткаў архітэктуры, якімі б яны ні былі.

Недалёка ад Мінска, каля Музея народнай архітэктуры і побыту, ёсць старадаўняе гарадзішча. Гэта каля зліцця ручая Дуная і ракі Менкі. Ёсць гіпотэза пачатку XX стагоддзя, што Мінск узнік менавіта там. Тое гарадзішча можна зрабіць цэнтрам славянскага адзінства: праводзіць фестывалі, арганізаваць спеўнае поле, як гэта зроблена, напрыклад, у суседняй Літве. Месца, дзе збіраюцца і спяваюць дзесяць тысяч чалавек. І работы многа не трэба: выкасіць кустоўе, зрабіць аўтастаянку, некалькі глядзельных пляцовак, а побач — Музей народнай архітэктуры і побыту. І ўсё будзе як мае быць.

***— Ці на дастатковым узроўні падтрымліваюцца нашыя архітэктурныя помнікі?***

— Паверце мне, ва ўсім свеце помнікі падтрымліваюцца не на сто працэнтаў дастаткова. Ва ўсіх краінах перш за ўсё робіцца стаўка на кансервацыю. А вось рэстаўруюцца сапраўды адметныя, гістарычна каштоўныя збудаванні. У большасці краін Еўропы помнікі ў стадыі кансервацыі. Рэстаўрацыя Парфенона і Калізея будзе працягвацца многія дзясяткі гадоў, літаральна па адной цагліне. Таму што рэстаўрацыя — гэта патрэба аднавіць самым адпаведным чынам. І да гэтага трэба імкнуцца. У савецкія часы былі зроблены істотныя памылкі, якія потым ЮНЕСКА заўважыла. Напрыклад, Тракайскі замак у Літве: тое, што было страчана, аднавілі са звычайнай цэглы. Таму ЮНЕСКА не надала гэтаму замку статус сусветнага здабытку. А Мірскі замак рэстаўраваўся амаль сорак гадоў — работа была праведзена якасна, і таму ён атрымаў міжнародны статус навукова-культурнай спадчыны.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

Трэба бачыць

# НАПЕРАД У МІНУЛАЕ!

## Узноўленая старажытная гравюра прадстаўлена ў Нацыянальнай бібліятэцы



**Калі вам цікава ўбачыць унікальную гравіраваную дошку XVII стагоддзя і адноўленую на яе аснове па старадаўняй тэхналогіі гравюру з партрэтам караля і вялікага князя Яна III Сабескага, абавязкова наведайце выстаўку «Узноўлены шэдэўр», якая праходзіць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі да 30 мая 2021 года. Прадстаўленая на выстаўцы медзяная дошка XVII стагоддзя выканана ў тэхніцы разцовай гравюры. Гэта адна з найбольш старажытных тэхнік гравіравання па метале, у якой заглыбленыя элементы рысунка атрымліваюцца з дапамогай вострага разца. На жаль, сучасныя беларускія майстры ўжо не працуюць у гэтай тэхніцы. Аднак да нашых часоў захаваліся дасканалыя беларускія металагравюры, уключаныя ў склад стадрукаў XVII—XVIII стагоддзяў, найлепшыя з якіх таксама прадстаўлены ў экспазіцыі.**

— Гэтая выстаўка вельмі важная, яна дэманструе знакавую з'яву ў мастацтве Беларусі і ўсёй Еўропы. Фактычна мы кажам пра тэхналагічны прарыў, які па-новаму дазволіў зірнуць на магчымасці выяўленчага мастацтва ў паліграфічнай прасторы. Мы прадстаўляем не проста дошку, а тэхналогію вытворчасці дакладных гравюр, распавядаем пра кнігавыдавецтва таго часу, — тлумачыць **намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Аляксандр СУША.**

Унікальнасць згаданага мерапрыемства яшчэ і ў тым, што тут можна ўбачыць не толькі саму арыгінальную дошку, але і гравюру, адноўленую з яе па старадаўняй тэхналогіі.

— Партрэт Яна III Сабескага быў завяршэннем грандыёзнага гравюрнага ліста, выкананага па ўсіх традыцыях параднага партрэта. Варта сказаць, што ён зроблены досыць блізка да арыгінала. Каштоўнасць гэтай гравюры ў тым, што яна ўяўляе сабой арыгінальную дошку, якую не сапсавалі 350 гадоў. У рэстаўратара атрымалася цалкам аднавіць гравюрны ліст, прыбраць карозію, — расказаў вядомы **бібліяфіл, калекцыянер гравюр і экслібрысаў Алег СУДЛЯНКОЎ.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Цікава, што адбітак з арыгінальнай меднай дошкі з'яўляецца фрагментам манументальнай кампазіцыі «Дадэкамерон Трыумфу Яна III», якая прысвечана дванаццацідзённаму паходу будучага караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна III Сабескага за татарскімі войскамі. У цэнтры гравюры дэталёва адлюстраваны сам польскі кароль, справа — татары, злева — удзячныя жыхары, якіх выратавалі ад нашэсця татараў. А за спінамі ўсіх герояў відаць карта Рэчы Паспалітай.

Падзеі тых часоў яскрава апісаў Уладзімір Караткевіч у «Паэме пра явар і каліну». Маці галоўнага героя звяртаецца да яго з такімі словамі:

*«— Яны спалілі Айчыну.*
*І ты з імі тое ж зрабі...»*

Сёння цяжка ўявіць тыя жахі рабства, забойстваў, калі не шкадавалі ні дзяцей, ні жанчын. Гэтая статычная і мірная, на першы погляд, гравюра нясе за сабой шлейф жудаснай, моцнай энергетыкі. Чым больш глядзіш на яе — тым глыбей упадаеш у намаляваныя падзеі. Гісторыю змяніць нельга, аднак заўсёды варта памятаць, што дзякуючы яе веданню мы вучымся, духоўна расцём і становімся лепшымі. Новая выстаўка ў Нацыянальнай бібліятэцы дае магчымасць не толькі даведацца больш пра беларускае кнігавыдавецтва, упэўніцца, што нашы майстры валодалі наймоўшымі тэхналогіямі, але і задумацца пра трагічныя падзеі мінулага.

**Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ.**

# Ваенныя падзеі вачыма сучасных падлеткаў

**Рэспубліканскі культурна-патрыятычны кінамарафон «Глядзі і памятай» стартаваў у краіне.**

Мерапрыемства прысвечана 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Першы этап прадугледжвае прагляд навучэнцамі ўстаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі мастацкіх кінафільмаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. Усе яны аб'яднаны ў сем тэматычных блокаў: «Пачатак вайны», «Маральны выбар на вайне», «Каханне і сяброўства на вайне», «Лёс жанчыны на вайне», «Дзеці на вайне», «Беларусь нязкораная» і «Мы з будучыні».

Прагляд фільмаў арганізуецца адзін раз у тыдзень у шосты школьны дзень у рамках кіналекторыяў і кінаклубаў. З кожнага тэматычнага блока рэкамендуецца праглядзець не менш за два фільмы на выбар.

Другі этап заключаецца ў распрацоўцы кінаплаката (відэароліка) па выніках прагляду па кожным тэматычным блоку. Кінаплакат (відэаролік) дазваляе навучэнцам у кароткай форме адлюстраваць свой погляд на ваенныя падзеі мінулай эпохі. У рабоце над кінаплакатам (відэаролікам) важныя распрацоўка назвы, слогана, лагатыпа (пры неабходнасці), сцэнарыя, падбор сродкаў выразнасці (выкарыстанне рэпартажных здымкаў, архіўных відэа- ці фотаматэрыялаў, камп'ютарнай графікі, анімацыі, мантажу, спецэфектаў і іншага).

Асабліва цэніцца аўтарская пазіцыя, арыгінальная трактоўка, стыль, тэхніка стварэння, наяўнасць кінацытат з прагледжаных кінафільмаў на ваенную тэму.

Кінаплакаты, прызнаныя найлепшымі ў ходзе рэгіянальных адбораў, будуць размешчаны на Нацыянальным адукацыйным партале.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Беларусь памятае

# На занятк у лясную школу

**У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрацуе «лясная школа», на заняткі ў якую завітаюць дзеці з абмежаванымі магчымасцямі Маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Адкрыццё» і ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Цэнтральнага раёна горада Мінска».**

Удзельнікі інтэрактыўнай праграмы змогуць даведацца, як у гады вайны навучаліся дзеці ў партызанскіх зонах, з якімі складанасцямі і нястачамі даводзілася ім сутыкацца. Не хапала пісьмовых прылад, падручнікаў, сшыткаў, паперы, чарніла. І тым не менш партызаны знаходзілі выйсце і ў такім становішчы. Дзякуючы іх вынаходніцтву нават у такі складаны час здолелі наладзіць вучэбны працэс.

Госці музея паспрабуюць сябе ў ролі вучняў лясной школы, будуць пісаць на бярозавай кары вуглём ці чарнілам, якія самі ж зробяць. Таксама яны створаць вучэбныя дапаможнікі для партызанскай школы і паўдзельнічаюць у майстар-класе па вырабе сцяга партызанскай брыгады. А пасля на ўроку музыкі разам з выхаванцамі дзіцячай музычнай студыі «Новае пакаленне» будуць спяваць папулярныя франтавыя песні.

Дабрачынная сустрэча ладзіцца ў межах мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Таямніцы сталіцы

# ЦУД-ГОРКА,

## або Сакрэты старога прадмесця

**Сёння мала хто з жыхароў Мінска ведае пра Траецкую гару — хоць менавіта такую назву насіла адно з самых старажытных буйных паселішчаў Старога горада. Сучаснае Траецкае прадмесце — толькі невялікая яго частка. Гістарычны цэнтр захоўвае процьму сакрэтаў. Разам з экскурсаводам Цімафеем АКУДОВІЧАМ адшукваем дамы, за якімі ажывае багатая і няпростая гісторыя...**

Драўляны замак, што месціўся ў старажытным Мінску, знаходзіўся ў нізіне, мясціны вакол яго былі балоцістыя, нязручныя для засялення, таму з XII стагоддзя людзі пачалі перабірацца на другі бераг і актыўна засяляць гару, якую празвалі Траецкай — хутчэй за ўсё, з-за храма, які на ёй размяшчаўся (ён стаяў на месцы Вялікага тэатра оперы і балета). У дакументах XV—XVI стагоддзя Траецкая гара некалькі гадоў згадваецца як «старое месца», што сведчыць: менавіта гэтая мясціна была адной з самых важных у гісторыі горада. Але чамусьці гара так і не стала цэнтрам горада, ратуша і найважнейшыя храмы былі пабудаваны на Верхнім рынку, хоць багатае і заможнае прадмесце таксама працягвала развівацца. На самым версе гудзелі кірмашы, ад гандлёвай плошчы ўніз разбягаліся вуліцы з храмамі, драўлянымі і цаглянымі дамкамі.

### ГІСТОРЫЯ ВІЗІТОЎКІ

Траецкая набярэжная за савецкім часам называлася Камунальнай. У часы Расійскай імперыі і нават пасля вайны тут знаходзілася забудаваная шэрагам дамоў вуліца. Будынкі былі не такія ўжо і старажытныя — справа ў тым, што ў 1809 годзе моцны пажар знішчыў усе драўляныя пабудовы. Прыкладна з таго часу была праведзена трасіроўка вуліц. І мясцовасць «абзавялася» класічнымі домікамі часоў Расійскай імперыі. Але пасля рэканструкцыі, якая была тут у 1980-х гадах, Траецкае прадмесце мяняе сваё аблічча — і яно ўжо не падобнае на той даваенны губернскі горад. Калі вы прагуляецеся па гэтым куточку Мінска, напэўна, зможаце вызначыць, якія будынкі засталіся ў старым выглядзе, а дзе моцна папрацавалі рэстаўратары.

Так, асобныя старыя будынкі тут захаваліся, у тым ліку дом Вігдорчыка на рагу былой Аляксандраўскай (цяпер вуліца Максіма Багдановіча), дзе ў канцы XIX стагоддзя пасяліўся Дамінік Луцэвіч, бацька Янкі Купалы. Ён спрабаваў зарабляць, працуючы рамізнікам, а будучы паэт у гэты час наведваў заняткі, дзе малых рыхтавалі да паступлення ў школу.

Старажылы яшчэ могуць згадаць, дзе стаяў будынак лазні, у якім у гады вайны размяшчалася падпольная друкарня і ствараліся маніфесты, што пасля раскідваліся па горадзе. Шыльда на лазні аб тым, што тут дзейнічала падпольная група, не ўратавала будынак ад зносу.

У 70-х гадах, калі актыўна абмяркоўвалася ідэя аб неабходнасці стварэння ў горадзе гістарычнага кутка, яна выдатна «клалася» на дамы ўздоўж Свіслачы. Тут захаваўся шэраг каменных дамоў XIX стагоддзя, праўда, былі яны ў жахлівым стане і суседнічалі з пасляваеннымі халупамі без выгод. І гэта ў цэнтры горада! Пакінуць усё як ёсць не выпадала — у 80-х гадах было не надта многа прыхільнікаў даўніны. Старыя будынкі жыхарам не падаваліся прывабнымі. Таму рэстаўратары і паспрабавалі правесці эстэтызацыю на новым ўзроўні. Дамы дабудавалі ў вышыню, расфарбавалі рознымі колерамі (быццам у сярэднявечнай Еўропе, дзе не было нумароў, а паштальёны адрознівалі дамы па колерах), дадалі мансарды, якіх раней не было. Траецкае прадмесце стала нагадваць утульны яскравы гарадок. Паступова да яго прызвычаіліся. Прадмесце становіцца брэндам для турыстаў і ўлюбёным месцам адпачынку гараджан. Актыўна прадаюцца паштоўкі з яго выявамі. У кавярнях тут падаюць смачную каву...

Вось толькі ў наш час з забудовай Зыбіцкай і аднаўленнем



Сувораўскае вучылішча.

храмаў на Верхнім горадзе Траецкае прадмесце стала пусцець, і ўжо варта задумацца, што можна было б зрабіць, каб сюды прываблівць больш гасцей. Адным з такіх пунктаў прыцягнення, на думку Цімафея Акудовіча, мог бы стаць музей яўрэйскай культуры, які варта было б размясціць у будынку Дома прыроды. А ўсё таму, што гэта былая сінагога XIX стагоддзя. Дарэчы, адзін з нешматлікіх будынкаў, які амаль цалкам захаваўся без умяшальніцтва рэстаўратараў. Наогул у Мінску было больш за 90 сінагог, і багата чаго можна распавесці пра адметныя жыццё, культуру і гісторыю мінскіх яўрэяў.

Называлася тая сінагога Кітаеўская, ёсць розныя версіі наконт паходжання назвы, і адна з іх звязана з... адзеннем. «Кітайкамі» ў XIX стагодзі называлі прывезены з Усходу шоўк. Тут была сінагога хасідаў — кірунку іўдаізму, які ўзнік на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, і адна з асаблівасцяў якога — у эмацыянальным звароце да Бога праз спевы, танцы. У хасідаў была любоў да яскравага адзення з тых самых «кітаек»...

Побач з Домам прыроды знаходзіцца адзін з найбольш загадкавых помнікаў, які экскурсаводы часам называюць сімвалам Траецкага прадмесця, і кожны па-рознаму тлумачыць усе дэталі кампазіцыі. На помніку — дзяўчына з савой, унізе — папараць-кветка і яшчарка: вось і вырашай, што пацерці, каб здабыць сабе нейкіх выгод: мудрасці, шчасця, кахання.

### ПАМЯЦЬ ЭЛІТНАГА ДОМА

Траецкае прадмесце — у тым ліку і месца, дзе трэба распавядаць пра трагедыі, якія адбываліся ў розныя часы. Пра адну з іх — загінулых у Афганістане салдат — нагадвае Востраў слёз. А зусім побач, праз дарогу, па адрасе Максіма Багдановіча, 23, захаваўся будынак трэцяга Дома Саветаў (першы знаходзіўся справа ад Чырвонага касцёла, другі — на перасячэнні вуліцы Карла Маркса з вуліцай Леніна). Пасля рэвалюцыі на савецкай тэрыторыі бальшавікі забіралі багатыя гасцініцы і пераназывалі іх у Дамы Саветаў, бо несалідна ж савецкім чыноўнікам жыць у гатэлі. А з 20-х гадоў для прадстаўнікоў новай улады пачалі ўзводзіць новыя дамы — натуральна, павышанай камфортнасці.

Трэці Дом Саветаў у Мінску пабудавалі ў 1936 годдзе. Шкляныя лесвічныя клеткі, шэры бетон, характэрныя формы нагадваюць пра канструктывізм. Кватэры тут былі з вялікімі столямі і ваннамі, утопленымі ў падлогу, як басейн. Асобны пад'езд быў з маленькімі кватэркамі — для прыслугі. Тут жыло шмат афіцэраў, міністр культуры. І нядзіўна, што ў 1937 годзе сюды часта заязджалі «чорныя варанкі». А пасля жыхароў Дома Саветаў напаткала яшчэ адна трагедыя. У 1941 годзе падчас першай жа бамбёжкі, у бомбасховішчы, якое і да сённяшняга дня знаходзіцца пад будынкам, загінула каля ста чалавек — жонак і дзяцей афіцэраў, што жылі па гэтым адрасе. Захаваліся нават здымкі з нямецкіх самалётаў, дзе яны бамбяць Траецкую гару і адна з бомб трапляе ў Дом Саветаў. Мінчане доўга ўспаміналі пра гэтую адну з самых першых буйных ваенных трагедый. Будынак пасля вайны аднавілі. Але шыльдаў пра адных з самых першых ахвяр Вялікай Айчыннай вайны на будынку няма, хоць варта было б іх тут зрабіць.

Насупраць Дома Саветаў захаваліся старыя будынкі аптэкі і дом Пінсуховіча, дзе ў XIX стагоддзі жылі афіцэры Серпухаўскага пяхотнага палка.

### КАРОТКАЯ ВУЛІЦА

Ад Траецкага прадмесця рухаемся на адну з самых кароткіх вуліц сталіцы, названую ў гонар вядомага пасляваеннага архітэктара Мінска Заборскага. Тут знаходзіцца адзін з аб'ектаў, над якім ён працаваў, — Суворавскае вучылішча.

У 1809 годзе, калі пажар нішчыў Траецкае прадмесце, у тым ліку згарэў і самы стары касцёл горада. На той момант біскупам мінскім быў Якуб Дадэрка, які вырашыў не аднаўляць храм, а пабудаваць новы, прычым каб гэта быў цэлы комплекс, з касцёлам і шпіталем. Але пачынаецца вайна 1812 года, біскуп прымае бок Напалеона Банапарта, нават узначальвае партыю прыхільнікаў французскага імператара. Як пазней аказалася, ён не на таго паставіў, вяртаюцца рускія войскі, і праз пэўны час Дадэрка з'язджае з Беларусі. Будоўля касцёла не была скончана. У 1830-х гадах на гэтае месца звяртаюць увагу праваслаўныя, каб пазней пабудаваць тут Мінскую духоўную акадэмію... Пасля Другой сусветнай вайны ад храма засталіся руіны. Заборскаму замовілі зрабіць замест іх будынак для навучання суворавцаў, дый па-багатаму. Вось толькі пасля смерці Сталіна пачынаецца барацьба з празмернасцямі. Ад пакарання архітэктара выратоўвае маршал Перамогі Цімашэнка, які ў гэты час жыў у Мінску...

Але давайце збочым ва ўнутраны дворык ды знойдзем месца, дзе нарадзіўся Максім Багдановіч. У 80-х гадах Адаму Багдановічу даверылі справу па стварэнні першай у Мінску прагімназіі — навучальнай установы, дзе дзеці маглі б атрымліваць належныя веды для таго, каб пасля працягнуць вучобу ў гімназіях. Раніцай Адам займаўся з дзецьмі, а ўвечары сядзеў на сустрэчах падпольнай партыйнай арганізацыі. Такое насычанае жыццё падрывае здароўе Адама, і ён разам з сям'ёй з'язджае са сталіцы.

Калі ў 80-х гадах аднаўлялася Траецкае прадмесце, планавалася аднавіць хату, у якой жыла сям'я Багдановічаў, але калі сродкі на будоўлю Траецкага былі ўрэзаны, пра мару аб аднаўленні будынка давялося забыць. Другая надзея на вяртанне будынка была звязана з будоўляй так званага «Дома Чыжа» — маўляў, калі ўзводзіцца такі маштабны, але недарэчны для мясцовасці будынак, варта было б у якасці кампенсацыі аднавіць хату, дзе нарадзіўся беларускі класік. Хаты так і няма, але ўзнік помнік — сведчанне таму, што яна тут стаяла. На ржавай сцяне (модная, як у Еўропе цяпер, «фішачка») змешчаны радкі з твораў Максіма Багдановіча. А сама пляцоўка вакол яго магла б стаць неблагім месцам, дзе жыхары горада маглі б сустракацца і чытаць вершы класіка...



Тэатр оперы і балета.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### У ПОШУКАХ БЕЛАЙ ЦАРКВЫ

Сапраўды грандыёзнае было будаўніцтва Тэатра оперы і балета. Ён і сёння нам падаецца вялікім (паспрабуйце даведацца, колькі насамрэч паверхаў у гэтым будынку, а некалькі з іх — пад зямлёй). Але першапачатковы праект быў яшчэ больш амбіцыйны. Спачатку планавалася, што асноўная глядзельная зала будзе разлічана на пяць тысяч чалавек (пасля скарачэння праекта абышліся лічбай у 1,5 тысячы месцаў). Хадзіла байка, быццам сам Сталін казаў, што не трэба ствараць у Мінску настолькі буйны тэатр, што ён будзе большы за тыя, што ёсць у Маскве і Піцеры.

Спускаемся з Траецкай гары і шукаем сляды былой Белай царквы. Раней тут нават была вуліца Белацаркоўная. Яна ішла ад Тэатра оперы і балета да месца, дзе сёння абеліск Перамогі. Сёння ад яе нічога не засталося. Ды і былы храм з багатай гісторыяй (ён звязаны з мітрапалітам Міхаілам Рагозам, які падпісаў Берасцейскую унію. Тут было і жаночае духоўнае вучылішча, а ў даваенны час — медыцынскі факультэт БДУ, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў моцна пашкоджаны. Пасля вайны на старыя муры «насадзілі» новыя, і атрымаўся іншы будынак, які мы сёння ведаем як Міністэрства абароны. Казалі, што архітэктар, які шчыраваў над гэтым праектам, надта абураўся, калі ў парку падраслі дрэвы, і патрабаваў іх спілаваць, бо яны закрываюць усю прыгажосць...

Сёння цяжка паверыць, што раней Траецкая гара была шчыльна аблеплена дамкамі. У гады вайны ўсё было выпалена. Але вырашана было на гэтых землях не распачынаць будоўляў, дакладней, пусціць іх пад паркі. Калі замежныя госці гуляюць па сталіцы, іх уражвае, што цэнтр горада, здавалася б, самая каштоўная з эканамічнага пункту гледжання зямля, не забудавана. Часам, калі гараджане дыскутуюць, які ж галоўны аб'ект Мінска, згадваюць будынкі і помнікі, але забываюцца пра паркавую структуру, што абрамляе Свіслач і вялізную Вілейска-Мінскую водную сістэму, хоць гэтая грандыёзная «зялёная» планіроўка горада вартая таго, каб падавацца на ўключэнне ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта наша «разыначка». У пасляваеннай Еўропе хіба вы яшчэ знойдзеце такі прыклад, каб усё ўзбярэжжа цэнтральнай гарадской ракі з абодвух бакоў было абсаджана паркамі?..

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**



Траецкае прадмесце — адзін з сімвалаў горада.

# АДКРЫВАЮЧЫ БЕЛАРУСЬ, АДКРЫВАЕШ СЯБЕ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Настасся, у вас ужо быў вопыт падарожжаў па Беларусі. Як пракладаеце маршрут?***

— Вядома, мы вывучалі краіну, але ездзілі ў папулярныя турыстычныя мясціны. А цяпер наўмысна ездзім па непапулярных. Турыстычныя мясціны заўсёды можна ўбачыць. Зараз найлепшы час пазнаёміцца з лакацыямі, да якіх ніколі б не даехаў.

Мы пракладваем маршрут з дапамогай звычайных «Гугл-картаў». Бяром адзін пункт, напрыклад, Мір, і глядзім, што цікавага ёсць вакол яго. Звяртаем увагу на назвы. Напрыклад, зачапіла назва Ішкалдзь, пачыталі, аказалася, што там выдатны касцёл. Да кожнай вандроўкі рыхтуемся — шукаем інфармацыю пра гісторыю гэтай мясціны, раздрукоўваем яе, каб у дарозе вывучыць. Нам цікавыя не толькі палацы ці культавыя збудаванні, якія ўжо адрамантаваны, але і сядзібы, што пакуль знаходзяцца ў заняпадзе. У адноўленых сядзібах паказана, як што было, ёсць мэбля, інтэр'еры з мінулых часоў. А ў закінутых сядзібах нічога няма, і адразу сам уяўляеш, якія тут былі пакоі, якія дамы і кавалеры хадзілі. Я спадзяюся, гадоў праз дзесяць мы вернемся ў адноўленую сядзібу і параўнаем свае ўяўленні з рэчаіснасцю. Ад кожнага будынка мы атрымліваем новыя веды пра род, які тут жыў, яго гісторыю, пра падзеі, што адбываліся. Мы нанава адкрылі для сябе серыю праграм «Зваротны адлік», якая некалі выходзіла на тэлеканале АНТ. Сёння ўсе выпускі ёсць у інтэрнэце, і ў будні мы глядзім дакументальныя фільмы пра мясціны, якія наведалі. Мы збіраем фотаздымкі ў альбомы, каб потым пераглядаць. Кожнае падарожжа мае працяг на доўгія месяцы.

***— А не крыўдна, што мноства цікавых мясцін знаходзіцца ў заняпадзе?***

— Крыўдна. Часта пад сваімі постамі ў сацыяльных сетках бачу каментарыі накшталт «нічога не робяць, нічога не рамантуюць». У некаторых мясцінах мы чуем гісторыі, як у перыяд савецкай улады людзі ратавалі царкву ці касцёл, на свае грошы іх утрымлівалі. А ў іншай вёсцы — самі ж месцічы гэты палац, сядзібу ці царкву і разабралі на цэглу. Да гэтага трэба ставіцца з паразуменнем: быў цяжкі час, людзям, магчыма, было не да гістарычнай спадчыны. І цяпер цяжка адразу адбудаваць усё, што было зруйнавана і знішчана, бо на гэта патрэбна шмат часу і грошай. Але радуе, што ўсё больш людзей звяртаюцца да сваіх каранёў і клапоцяцца аб тым, што ёсць. Я звярнула ўвагу, што валанцёры самі аднаўляюць сядзібы. Вельмі лёгка крытыкаваць, казаць, што нічога не робіцца. А патраціць свой выхадны на тое, каб прыбраць смецце ў сядзібе, нешта адрамантаваць — ужо ўклад. І гэта робяць людзі, у якіх няма вялікіх грошай, яны проста збіраюць вакол сябе энтузіястаў.

Калі мы былі ў вёсцы Паланечка Баранавіцкага раёна, да нас падышла жанчына і спытала, ці не мы новыя гаспадары палаца, які доўга спрабавалі прадаць. Мы б і хацелі быць яго гаспадарамі, але матэрыяльна не пацягнем... А праз нейкі час даведаліся, што гаспадары палаца знайшліся. Спадзяюся, у іх усё атрымаецца.

***— Ваша самае цікавае адкрыццё падчас падарожжаў?***

— Самае цікавае ва ўсіх вандроўках — не гістарычныя пабудовы, а нашы беларускія людзі. Мы іх для сябе адкрываем. Усюды мясцовыя жыхары вельмі шчырыя, адкрытыя людзі, кожны гатовы дапамагчы, расказаць цікавыя гісторыі. У Лявонпалі, невялікай вёсачцы ў Віцебскай вобласці, пазнаёміліся з мясцовай жыхаркай Марыяй Карпіцкай, ёй 94 гады і яна памятае пана, які тут жыў. Расказала шмат цікавага пра яго, пра школу, дзе выкладалі толькі на польскай мове, як яе пераводзілі на беларускую мову. Такія цікавыя факты ведаюць толькі мясцовыя жыхары.

Нас усюды вельмі гасцінна сустракаюць. У Косаўскім замку працуюць вельмі шчырыя людзі, правялі экскурсію, паказалі пакоі, якія толькі будуць адкрывацца для наведвання. Паказалі гасцініцу ў Косаўскім палацы, дзе ў шыкоўных нумарах можна пажыць так, як жылі магнаты, і адчуць энергетыку беларускай гісторыі. Часта культавыя пабудовы зачыненыя для наведвання турыстамі і адкрываюцца толькі падчас імшы. У Косаве каля касцёла вісела абвестка, што можна патэлефанаваць, і жанчына-прыхаджанка прыйдзе і правядзе экскурсію. Так і адбылося. Мы былі вельмі ўдзячныя, бо рэдка ўдаецца паглядзець будынак знутры.

***— А якія мясціны вас найбольш уразілі?***

— Пасля кожнай вандроўкі мы кажам, што вось гэтае месца самае цікавае, кожнае ўражвае больш за іншыя. Мінулай восенню мы бралі экскурсію «Журавы і журавіны» на балоце Ельня. Уразілі і журавы, і сама экасістэма, Мёршчына. Прырода ўсюды ўражвае. Я думала, што самы прыгожы — Лепельскі край. Але адкрылі для сябе Браслаўшчыну і ўбачылі, як там прыгожа, потым з'ездзілі на Гомельшчыну, на Брэстчыну. І запытайце мяне, дзе прыгажэй за ўсё, я не скажу, таму што ў кожным кутку Беларусі ёсць свая адметнасць, якая вабіць. Я паўсюль раблю дзясяткі фотаздымкаў. Сын пытаецца, навошта, бо ніводны фотаапарат ці тэлефон не перададуць такой прыгажосці. Але мне хочацца захаваць гэтыя краявіды. Нас вельмі ўразіў музей стараверства і беларускіх традыцый у Ветцы, якому многія музеі пазайздросцяць. Мы туды прыйшлі з разлікам, што прабудзем недзе гадзіну, але за тры з паловай нават пяцьдзясят працэнтаў экспазіцыі не паглядзелі. У кожнага экспаната свая гісторыя — людзей, краіны, часу. Косава ўразіла не толькі замкам і касцёлам, але і гісторыяй Тадэвуша Касцюшкі. У маім разуменні гэта быў змагар за незалежнасць, але калі пачалі больш чытаць, адкрылі яго як чалавека, які не змог наладзіць сваё асабістае жыццё, змагаўся за свабоду кожнага, супраць рабства і ў ЗША, і ў сваіх беларускіх маёнтках. Уражваюць гісторыі звычайных людзей, напрыклад, гісторыя чатырох жанчын, якія аддавалі свае пенсіі на ўтрыманне касцёла ў Косаве.

Мужу, як усім мужчынам больш цікавыя тэхнічныя збудаванні. Ездзілі сям'ёй у вандроўку на байдарках па Аўгустоўскім канале. Мы, вядома ж, ведалі пра яго, але такі маштаб гідратэхнічнага збудавання нават не маглі ўявіць. І муж доўга і ўважліва разглядаў, як там усё зроблена, а я больш любавалася краявідамі.

Нядаўна, выбіраючы, як правесці адпачынак — застацца ў Беларусі ці паехаць за мяжу — мы разгледзелі матэрыяльны бок і што мы можам атрымаць духоўна, і вырашылі свой адпачынак вясной правесці ў Беларусі.



***— Лічыцца, што кожнае падарожжа па-новаму адкрывае самога чалавека. Што вы ў сабе адкрылі, вандруючы па Беларусі?***

— Беларусь жа невялікая краіна, і ў кожнага беларуса ёсць куток, звязаны з яго сямейнай гісторыяй. Таму мы адкрываем гісторыю не толькі краіны, але і сваю ўласную, цікавімся пра сваіх продкаў, шукаем фотаздымкі прабабуль, прадзядуль. У вёсцы Сар'я цудоўны касцёл, і я ведаю, што там хрысцілі маю прабабулю, што яна вучылася ў школе пры касцёле. Былі на маёй радзіме ў Гомельскай вобласці, там у вёсцы Шарсцін ёсць невялікая каплічка Параскевы Пятніцы. І ўразіла не сама капліца, а людзі, якія яе даглядаюць. Ездзіла па мясцінах, дзе жылі продкі мужа, і адкрылі для сябе просты, але цікавы горад Беразіно з цудоўнай сядзібай.

***— Настасся, чаго, на ваш погляд, у Беларусі не хапае для турыстаў?***

— Элементарнай інфраструктуры, прыбіральняў. Не хапае пунктаў харчавання, дзе можна нармальна паесці. Асабліва гэта важна для людзей, якія вандруюць з дзецьмі. Мы знайшлі выйсце — бяром з сабой паходныя столік, крэслы і ежу. Ёсць нейкі шарм у тым, каб седзячы на беразе возера, есці бульбу ў мундзірах, сала. Зімой спыняемся ў гатэлях, пазітыўна зарэкамендавалі сябе гасцініцы на перыферыі — добрыя ўмовы, даступныя цэны. Але не ўсюды: у некаторых гатэлях цэннік за ноч можа быць 100—120 рублёў, зразумела, што не кожная сям'я можа сабе гэта дазволіць. Узнікаюць складанасці з музеямі, яны ў асноўным працуюць да 18.00 і не заўсёды паспяваеш іх наведаць. Мы ўжо два гады не можам трапіць у музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, бо ён працуе ў будныя дні да 18.00. Было шкада, калі прыехалі ў Віцебск і даведаліся, што дом-музей Марка Шагала па аўторках не працуе, бо інфармацыі пра гэта нідзе не было.

Вядома, там, дзе ёсць турыстычная аб'екты, і сэрвіс, і інфраструктура добрыя. А дзе іх няма, узнікаюць праблемы. Але трэба граматна прадумаць маршрут. Летам можна вандраваць з палаткай, для дзяцей гэта будзе прыгода. Мы вось летам абавязкова з палаткай паедзем на Браслаўшчыну.

***— У вас ёсць адказ на пытанне, чаму беларусы мала падарожнічаюць па сваёй краіне?***

— Я думаю, раней не было такой патрэбы. Усе думалі, што Беларусь яны могуць заўсёды паглядзець, а магчымасць убачыць Іспанію ці Італію выпадае нячаста. Але ў 2020 годзе людзі зразумелі, што жыццё вельмі непрадказальнае і «потым», на якое ўсё адкладвалі, можа не надысці. Таму зараз найлепшы час пазнаёміцца з Беларуссю, тым больш што за выхадныя можна ўбачыць і даведацца шмат цікавага. Проста хочацца сказаць: «Людзі, хопіць сядзець у сваіх кватэрах, выбірайцеся як мінімум за горад». Побач з тым жа Мінскам безліч цікавых мясцін: Вязынка, Ракаў, Радашковічы, музей «Сула», дзе максімальная канцэнтрацыя ўсяго беларускага. Калі раней па рабоце прымалі замежныя дэлегацыі ці прыязджалі сябры з іншых краін, я заўсёды старалася паказаць ім Беларусь. Цяпер сябры актыўна ў нас цікавяцца, куды можна паехаць на выхадныя. І незадаволеных падарожжамі па Беларусі няма. Мне гэта вельмі прыемна, бо я ганаруся сваёй краінай і хачу, каб яна ўражвала і здзіўляла як мага больш людзей.

***— Назавіце, калі ласка, топ-5 мясцін для наведвання кожным беларусам.***

— Цяжкае пытанне... Абавязкова трэба пабываць у музеі беларускіх традыцый у Ветцы, касцёле ў Ішкалдзі. Кожнаму беларусу трэба ўбачыць Аўгустоўскі канал. Абавязковая для наведвання вёска Вялікая Ліпа ў Сноўскім раёне. Там выдатная сядзіба, лепш туды ехаць восенню ці зімой, калі няма вялікіх зараснікаў і можна добра разгледзець пабудовы. Палац у Жылічах — гэта беларускі Версаль з шыкоўнымі столямі. Неабходна праехаць па маршруце возера Кромань — Любча — Шчорсы — Навагрудак — Літоўка — Станькава. Не бойцеся самі распрацоўваць маршруты — вакол мноства цікавага, а мясцовыя жыхары заўжды вам дапамогуць ды яшчэ і цікавых гісторый раскажуць. Падарожжа будзе незабыўнае.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з асабістага архіва гераіні.**

Спорт-тайм: наш фармат

# НОВЫ ТЫДЗЕНЬ — НОВЫЯ ГЕРОІ

**У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем самыя цікавыя навіны**

**ГЕРОЙ ТЫДНЯ.** Генадзь Лапцеў заваяваў малую «бронзу» чэмпіянату Еўропы па цяжкай атлетыцы ў рыўку. Беларусу скарылася вага ў 132 кілаграмы. У штуршку яму ўдалося падняць 154 кілаграмы. У суме дваябор'я Генадзь заняў чацвёртае месца, набраўшы 286 кілаграмаў.

Усяго за медалі турніру спаборнічаюць 18 беларускіх спартсменаў. На чэмпіянат Еўропы заяўлены Генадзь Лапцеў (вагавая катэгорыя 61 кг), Дзмітрый Іваноў (67 кг), Ілья Жарноўскі (73 кг), Мікалай Чарняк (81 кг), Сяргей Гаранін (89 кг), Пётр Асаёнак (96 кг), Андрэй Арлёнак, Сяргей Шаранкоў (102 кг), Андрэй Арамнаў і Эдуард Зязюлін (звыш 109 кг). У дзяўчат за медалі будуць змагацца Любоў Дзямідавец, Аліна Шчапанава (71 кг), Рына Літошык, Дар'я Навумава (76 кг), Дзіяна Мінкова, Дзіна Сазанавец (81 кг), Інна Захарчук (87 кг), Кацярына Андрэйкавец (звыш 87 кг). Усяго ўдзел у кантынентальным першынстве возьмуць 315 атлетаў з 38 краін.

**ГЕРАІНЯ ТЫДНЯ.** Тэнісістка Ганна Кубарава — пераможніца міжнароднага турніру серыі ITF Women's World Tennis Tour з прызавым фондам $15 000 — MAGIC TOURS (W15 MONASTIR). Ганна, будучы другой ракеткай турніру, пачала выступленне ў адзіночным разрадзе з няпростай перамогі над прадстаўніцай Харватыі Антоніяй Рузіч — 6:1, 6:7, 6:2. У другім крузе яна абыграла Еву Ведэр з Нідэрландаў — 5:7, 7:5, 6:4. У 1/4 фіналу Ганна аказалася мацнейшая за сербскую тэнісістку Лолу Радзівоевіч — 6:7 (5), 6:2, 6:1. У паўфінале беларуска перайграла прадстаўніцу Індыі Карман Каур Тхандзі — 7:6 (3), 6:3. У вырашальным фінальным паядынку Ганна перамагла Анжаліку Рагі з Італіі — 6:1, 6:1. У парным разрадзе Ганна Кубарава разам з Настассяй Няфёдавай з ЗША спыніліся на стадыі паўфіналу.




Для дваццацігадовай Ганны тытул у Тунісе стаў другім у прафесійнай кар'еры.

**ТУРНІР ТЫДНЯ.** На базе спартыўнага комплексу «Стайкі» прайшоў спартыўна-дабрачынны турнір па тайскім боксе «Смелы крок». Арганізатары праекта — Прэзідэнцкі спартыўны клуб, Міністэрства ўнутраных спраў, Беларуская федэрацыя кікбоксінга і тайландскага бокса.

У камандным першынстве пераможцамі сталі спартсмены Мінскай вобласці. Другое месца ў гамяльчан. Замкнулі тройку наймацнейшых атлеты з Полацка. Найлепшым байцом турніру прызнаны Раман Музычэнка з Гомеля. За волю да перамогі ўзнагародзілі Мікіту Юманава з Магілёва.



**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Каманда Мінскай вобласці «Гарызонт» упершыню заваявала тытул чэмпіянату Еўрапейскай жаночай баскетбольнай лігі. У фінальным паядынку, які праходзіў у Маладзечне, беларускі перамаглі расійскую каманду «Ніка» з Сыктыўкара. Сустрэча скончылася з вынікам 70:60. Самым каштоўным гульцом турніру прызнана баскетбалістка «Гарызонта» Настасся Верамеенка.

Маладзечанцы і госці горада горача падтрымлівалі любімую каманду. Сярод заўзятараў прысутнічаў і старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын. На трыбунах быў і прэзідэнт EWBL Іга Зандэрс. Ён адзначыў, што ў Беларусі вельмі высокі ўзровень баскетбола, а «Гарызонт» — адна з найлепшых каманд у Еўропе. На думку Іга Зандэрса, не варта змешваць спорт і палітыку. Ёсць унутраныя справы, а ёсць спорт. «Я прапанаваў бы ўсім атрымліваць асалоду ад гульні, а не ўмешваць сюды палітычны складнік», — канстатаваў ён.

З перамогай трэнераў і гульцоў каманды павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Ваш дружны калектыў яшчэ раз даказаў, што беларускія спартсмены здольныя дасягаць добрых вынікаў у гульнявых камандных відах спорту. Малайцы, дзяўчаты, так трымаць», — перадае віншаванне БелТА.

**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Савет дырэктараў Кантынентальнай хакейнай лігі зацвердзіў састаў удзельнікаў наступнага сезона. Па выніках нарады кіраўнікоў хакейных клубаў КХЛ было вырашана, што ў сезоне 2021/2022 у рэгулярным чэмпіянаце будуць удзельнічаць 24 клубы. Сярод іх — мінскае «Дынама». Чакаецца вяртанне ў спіс удзельнікаў лігі — «Адмірала» з Уладзівастока.

Акрамя мінскага і ўладзівастоцкага клубаў у КХЛ сезона 2021/2022 згуляюць: «Авангард» (Омск), «Аўтамабіліст» (Екацярынбург), «Ак Барс» (Казань), «Амур» (Хабараўск), «Барыс» (Нур-Султан), «Віцязь» (Маскоўская вобласць), «Дынама» (Масква), «Дынама» (Рыга), «Ёкерыт» (Хельсінкі), «Куньлунь Рэд Стар» (Пекін), «Лакаматыў» (Яраслаўль), «Металург» (Магнітагорск), «Нафтахімік» (Ніжнякамск), «Салават Юлаеў» (Уфа), «Северасталь» (Чарапавец), «Сібір» (Новасібірск), СКА (Санкт-Пецярбург), «Спартак» (Масква), «Тарпеда» (Ноўгарад), «Трактар» (Чэлябінск), ХК «Сочы» і ЦСКА (Масква).

**ЦЫТАТА ТЫДНЯ.** «Мы рады. Сезон цяжкі, многае мянялася ў календары. Сёння атакавалі на высокіх мячах. Што датычыцца саперніка, то добра, што не пяць партый. Выканалі свой план. Усіх з перамогай» , — сказаў Віктар Бекша, галоўны трэнер валейбольнага клуба «Шахцёр». У трэцім матчы фінальнай серыі чэмпіянату Беларусі па валейболе «Шахцёр» абыграў «Будаўніка» і стаў чэмпіёнам краіны. Вынік вырашальнай сустрэчы — 3:1 (25:16, 25:22, 20:25, 25:22).

Гэта ўжо пятая перамога ў гісторыі салігорскага клуба. «Шахцёр» — чэмпіён Беларусі ў 2017, 2018, 2019 і 2020 гадах.

**НЯЎДАЧА ТЫДНЯ.** Футбалісты зборнай Беларусі няўдала правялі другі матч адборачнага турніру чэмпіянату свету 2022 года. Беларусы ўступілі камандзе Бельгіі з вынікам 8:0. Гэта самае буйное паражэнне беларускай зборнай у гісторыі.

Напрамую ў фінальную стадыю планетарнага форуму ад Еўропы выйдуць пераможцы 10 кваліфікацыйных груп. Каманды, якія фінішуюць другімі, а таксама дзве найлепшыя зборныя з Лігі нацый правядуць паядынкі за тры пропускі на чэмпіянат свету.

**НАДЗЕЯ ТЫДНЯ.** Каманда Гродзенскай вобласці выйграла маладзёжны чэмпіянат Беларусі па вольнай барацьбе (U-23). Пераможцы каманднага заліку набралі 180 ачкоў. На другім месцы — прадстаўнікі Мінска, у актыве якіх 159 балаў. Замкнулі тройку наймацнейшых барцы Гомельскай вобласці, якія зарабілі 155 пунктаў.

У асабістым заліку два залатыя медалі заваявалі спартсмены Гродзеншчыны — Данііл Амельянчык (70 кг; Гродна) і Яраслаў Славікоўскі (125 кг; Абухава).Таксама перамогі святкавалі гамяльчане Дзмітрый Шамела (57 кг) і Аляксей Пархоменка (97 кг), віцябляне Давуд Алізалаў (74 кг) і Аркадзь Пагасян (92 кг), а таксама мінчане Ягор Акуліч (79 кг) і Ілья Хамцоў (86 кг). Чэмпіёнамі ў сваіх вагавых катэгорыях сталі прадстаўнікі Брэстчыны Ілья Рагозаў (61 кг) і Магілёўшчыны Уладзіслаў Кайко (65 кг).

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Даты | Падзеі | Людзі

**6 КРАСАВІКА**

У краіне

**1901** год — нарадзіўся Арцемій Мікіціч Філіповіч, беларускі вучоны ў галіне інфекцыйных хвароб, член-карэспандэнт АМН СССР, доктар медыцынскіх навук, прафесар.

**1921** год — нарадзіўся (Бабруйск) Аляксей Фадзеевіч Сямёнаў, поўны кавалер ордэна Славы.



**1936** год — нарадзіўся Аркадзь Маркавіч Саўчанка, спявак, народны артыст БССР, народны артыст СССР.

У гэты ж дзень нарадзіўся Генадзь Серафімавіч Шупенька, беларускі літаратуразнаўца, крытык.

Таксама ў гэты ж дзень нарадзілася Вікторыя Станіславаўна Казлова, беларускі рэжысёр тэатра лялек.

**1946** год — нарадзілася Валянціна Міхайлаўна Коўтун (Новік), беларуская паэтка, кандыдат філалагічных навук. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова.

**1951** год — нарадзіўся Алег Антонавіч Яноўскі, беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук, прафесар.

**2001** год — у Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь зарэгістраваныя герб і сцяг г. Добруш і Добрушскага раёна.

У свеце

**1826** год — нарадзіўся Густаў Маро, французскі мастак. Аўтар міфалагічных, рэлігійных, алегарычных кампазіцый.

**1836** год — нарадзіўся Мікалай Васілевіч Скліфасоўскі, расійскі хірург, грамадскі дзеяч, доктар медыцыны, прафесар медыцынскага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта. Адзін з піянераў укаранення прынцыпаў антысептыкі ў рускай хірургіі, а таксама хірургіі брушной поласці і ваенна-палявой хірургіі. Яго імя прысвоена Маскоўскаму НДІ хуткай дапамогі.



**1841** год — нарадзіўся Іван Захаравіч Сурыкаў, рускі паэт.

**1911** год — нарадзіўся Феадор Лінен, нямецкі біяхімік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіялогіі і медыцыне.

**1956** год — нарадзіўся Ігар Армэнавіч Саруханаў, расійскі эстрадны спявак, кампазітар, заслужаны артыст РФ.

Так гаварыў...

**БЭКАН:**

*«У жыцці — як у дарозе: самая кароткая — звычайна самая гразкая, ды і доўгая не нашмат чысцейшая».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.30 | 19.55 | 13.25 |
| Віцебск — | 6.18 | 19.47 | 13.29 |
| Магілёў — | 6.20 | 19.45 | 13.25 |
| Гомель — | 6.19 | 19.40 | 13.21 |
| Гродна — | 6.45 | 20.10 | 13.25 |
| Брэст — | 6.48 | 20.08 | 13.20 |

### Месяц

***Апошняя квадра 4 красавіка. Месяц у сузор'і Вадаліва.***

### Імяніны

***Пр.** Арцёма, Захара, Пятра, Сцяпана, Уладзіміра, Якава.*
***К.** Ады, Ізольды, Вільгельма, Пятра, Часлава.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Анжэла і Максім былі ў такіх сур'ёзных адносінах, што ніколі не ўсміхаліся.

**— Мне вельмі падабаецца твая салата. У чым сакрэт смаку?**
**— Усё вельмі проста. Я заўсёды дадаю ў яе крыху пельменяў.**

— Вось ведаеш, Андрэй, я пайшла б на многае дзеля цябе. Але мне няма ў чым.

**— Генадзь, я хачу жыць з табой доўга і шчасліва!**
**— Юля, калі ты будзеш жыць шчасліва, я доўга не працягну!**

— Найлепшы падарунак — гэта грошы. Яшчэ ні разу не чуў, каб сказалі: «Дзякуй, але такія ў мяне ўжо ёсць!»




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1030.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 красавіка 2021 года.